©ГДУ

# ПСІХАЛАГІЗМ ТВОРАЎ В. ГІГЕВІЧА

***В.М. ГРЫНЬ*, Т.А. ФІЦНЕР**

This article provides a brief description of V. Gigevich's fantastic literature: the novels «The Centaurs», «Sinner, don't forget about your house», stories «The ship», «The Martian journey», «Pabaki». Author's ideas and beliefs are defined on the basis of the study problems the works, as well as on the basis of characteristics of the heroes. By studying the works of noted author determined the significance of creativity for the modern reader

Ключавыя словы: фантастыка, псіхалагізм, праблематыка, умоўнасць, вобразнасць

У аповесці «Карабель» аўтар адлюстраваў псіхалагічны стан чалавека ў таталітарнай дзяржаве, паказаў разгубленасць «маленькага» чалавека перад уладай над ім рознага кшталту камандзіраў і кіраўнікоў, а таксама разгубленасць перад уладай, што апынулася ў руках самога «маленькага» чалавека. Вобраз Ёха – гэта абагулены вобраз чалавека, што пакутуе ад абмежавання сваёй волі.

У рамане «Кентаўры» В. Гігевіч разглядае вынікі ўздзеяння навукова-тэхнічных адкрыццяў на псіхалогію і жыццё чалавека. Ён прапануе чытачу разгледзець і даследаваць тую сітуацыю, якая можа

складаціся, калі вучоным удасца штучна стварыць жывых істот, якія арганізоўваюцца ў сваю цывілізацыю. Разглядаюцца неадназначныя паводле сваіх вынікаў, непрадказальныя праблемы навукова-тэхнічнага прагрэсу, дзе многае залежыць ад такога хісткага і расплывістага крытэрыя, як маральнасць вучонага.

Раман «Не забывай пра дом свой, грэшнік» – твор аб вучоных, што сваімі адкрыццямі ўздзейнічаюць на існаванне ўсяго чалавецтва. Аўтар падкрэслівае, што тыя ці іншыя справы вучоных, іх адкрыцці могуць прывесці да спекуляцыі на псіхалогіі *звычайных* людзей. Пісьменнік кажа аб адказнасці кожнага з нас за свае дзеянні.

З аповесці «Пабакі» вынікае, што Горад уздзейнічае на чалавека не лепшым чынам: гараджане гатовыя прыстасоўвацца да любых умоў. Яны гатовыя страціць сваё аблічча, забыўшыся на адвечныя маральныя і духоўныя каштоўнасці, у тым ліку забыўшыся на свабоду. Аўтар падкрэслівае, што пабакі могуць з'явіцца ў любым *горадзе*. І ад таго, як будзе паводзіць сябе чалавек, залежыць яго будучыня.

У аповесці «Марсіянскае падарожжа», як і ў папярэдніх творах, аўтар разглядае ўздзеянне на чалавецтва навукова-тэхнічнага прагрэсу (НТП). В. Гігевіч упэўнены ў адмоўным уплыве НТП на развіццё ўсяго чалавецтва, на захаванне маральных каштоўнасцей, якімі заўсёды кіраваліся беларусы. На думку аўтара, паглыбляючыся ў тэхнічны прагрэс, людзі забываюць аб сваіх сапраўдных абавязках і аб сваім абліччы.

В. Гігевіч даследуе ў творах праблему выхавання, адукацыі. Ён паказвае, якую ролю адыгрывае ў жыцці моладзі правільнае выхаванне. Яно развівае ў чалавека самастойнае мысленне, спрыяе захаванню пачуцця асабістай свабоды і значнасці.

Сюжэты фантастычных твораў пісьменніка звязаны паміж сабой: у іх расказваецца аб уздзеянні навукова-тэхнічнага прагрэсу і навуковых пошукаў вучоных на чалавецтва. В. Гігевіч упэўнены ў тым, што любы чалавек павінен адказваць за свае дзеянні, у тым ліку і ў галіне навукі. Таксама аўтар лічыць, што чым больш тэхнічна развітая краіна, тым больш яна схільная да самаразбурэння.

Героі твораў В. Гігевіча нібыта самі расказваюць чытачу аб сваіх праблемах, радасцях і бедах. Аўтар глыбока пранікае ва ўнутраны свет герояў, звяртае ўвагу на адценні перажыванняў і стан душы персанажаў. Праблемы, якія закранае ў сваіх творах пісьменнік, знаходзяць вырашэнне праз рэфлексаванне, перажыванне асабістых бедаў персанажаў. Яго героі задаюць пытані самі сабе, адказваюць на іх і нібы чакаюць рэакцыі чытача. Аўтар падштурхоўвае чытача да роздуму, разважанняў, пэўных высноў.

В. Гігевіч спасцігае глыбінныя праблемы чалавечага існавання, раскрывае рухі чалавечай душы і дасягае глыбокага псіхалагізму сваіх твораў. Пісьменнік даводзіць, як востра неабходна чалавецтву задумацца аб сваёй дзейнасці і ролі на зямлі.